Цана асобнага нумару 20 грошау.

Сын Беларуса

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 2 злотыя
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 грош., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 36. Вільня, Пятніца, 5-га верасьня 1924 г. Год. I.

Пагрозы міру.

У сувязі з праектам агульнага разбраеньня, які мае разглядаць распачатая толькі-што сэсія пленуму Лігі Народаў, уся заграгічная прэса вельмі паважна займаецца пытаньнем аб *прычынах, якія выклікаюць пагрозы нарушэньня сусьветнага міру*.

Вось-жа ў гэтым пытаньні на першы плян высоўваюцца два мамэнты, якіх не зьліквідаваў ані Вэрсальскі мір, ані новыя Лёнданскія умовы паміж Нямеччынай і дзяржавамі перамоўжцамі.

У першы чарод трэба адзначыць *канкурэнцыю паміж сучаснымі капіталістычнымі дзяржавамі* на грунце прамысловасьці і гандлю. Гэтая канкурэнцыя вынікае з самае істоты капіталістычнага ладу, каторы можа істнаваць толькі пры умове няўстаннага росту прамысловасьці і здабываньня ўсё новых і новых рынкаў збыту. Вось-жа ніводная з найбольш нават дэмакратычных праграмаў дагэтуль не знайшла лякарства на тое, каб вызваліць капіталістычныя дзяржавы ад гэнае няўхільнае канкурэнцыі і замяніць яе супрацоўніцтвам, вольнай *каапэрацыяй народаў*.

Немагчыма дайсьці гэткае каапэрацыі народаў яшчэ і затым, што, як у Вэрсальскай Эўропе, так і наагул блізу на ўсім сьвеце *паняцьце народу і паняцьце дзяржавы не пакрываюцца ўзаемна*. Апрача Саюзу Сацыялістычных Радавых Рэспублік, якія пабудаваны паводле нацыянальнага прынцыпу, ў-ва ўсіх тых дзяржавах, у якіх жыве некалькі нацыянальнасьцяў, звычайна адна—дужэйшая—пануе над усемі другімі, як „дзяржаўная нацыя“, лічучы, што яна зьяўляецца „прыражоным гаспадаром“, свайго роду прыгоншчыкам для ўсіх нацыянальных меншасьцяў. На гэтым грунце, на гэтым імкненьні „дзяржаўнае“ нацыі панаваць над „недзяржаўнымі“, на жаданьні яе няволіць тыя народы, якія пазбаўлены дзяржаўнае самастойнасьці,—паўстае непрымірымая барацьба паміж рознымі групамі грамадзян аднае дзяржавы. І калі асьлепленая пачуцьцём сваей сілы і ўлады нацыя ня ўмее ўсьцерагчыся гэнае барацьбы, дык гэта знамяніта выкарыстываюць проці яе дзяржавы-канкурэнты, асабліва ў тых выпадках, калі ўціснаная меншасьць яе жыве ня ўся ў межах гэткае дзяржавы, а ўваходзіць і ў склад другіх. Вось тады *нацыянальнае пытаньне* прадстаўляе ня менш паважную пагрозу міру, як пытаньне эканамічна-гаспадарчае.

Калі падпісываўся Вэрсальскі мір, дык у поўнай меры выявілася немагчымасьць забясьпечыць сьвет ад новых войн: знамянітыя 14 пунктаў Вільсона былі адкінуты Антантай, бо, паўтараем, яны не маглі быць праведзены ў жыцьцё пры захаваньні ў поўнай меры *капіталістычных адносінаў* і пры падмене паняцьця *народаў* паняцьцем *гаспадарстваў*. І толькі спусьціўшы некалькі гадоў тварцы міравых трактатаў 1919 году пачынаюць разумець, наскольки пустымі, бяз ніякага грунту былі іх рожавыя надзеі на „моцны, сталы мір“.

Знамянітая кніжка б. італьянскага прэм'ера Нітті „Эўропа бяз міру“ дужа добра асьвяціла Вэрсальскі мір з боку эканамічна-гаспадарчага. Цяцер-жа дужа добра падыйшоў да значэньня нацыянальнага пытаньня Лёйд-Джордж.

Ніжэй мы друкуем заметку, з якое відаць, што гэты вялікі англійскі палітык найвялікшай пагрозай міру лічыць гэткія *нацыянальныя канфлікты*: балканскі, бэсарабскі (паміж Румыніяй і ССРР), *беларуска-польскі* і украінска-польскі, за якімі—іменна за двума апошнімі — крыецца адвечны канфлікт *польска-расейскі*.

Як бачым, галоўная пагроза эўрапэйскаму, а мо' і сусьветнаму міру гэтым разам зьвязана з Польскай рэспублікай: бо-ж, апрача двух пералічаных канфліктаў з Беларусьсю і Украінай, у яе істнуе яшчэ дужа паважны канфлікт на эканамічным і нацыянальным грунце з Нямеччынай, ды йшчэ з Літвой, а мо' і з другімі суседзямі...

І можна толькі шчыра дзівіцца, што польскія палітыкі і польская прэса, замест выпаўняць свой грамадзкі абавязак, шчыра і адкрыта асьвятляючы палітычнае палажэньне Польскае рэспублікі, ды замест шукаць выхаду з гэтага палажэньня на адзіным магчымым грунце—грунце *паразуменьня і каапэрацыі* перш за ўсе *з „сваімі“ нацыянальнымі меншасьцямі*, толькі стараюцца усыпіць сваё грамадзянства і ў салодкім сьне напяваць яшчэ больш салодкія „вялікадзяржаўныя“ песьні.

Факт, што польская прэса (дзякуючы тэлеграме ПАТ-а) *укрыла* заяву Лойд-Джорджа аб значэньні справы Беларусі,—гэта адна з больш яркіх праяваў гэтага самагубнага самаашуківаньня.

Беластоцкі працэс на міжынародавым форуме.

У суботу, 23 жніўня, на засяданьні **„Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна“** ў Парыжу разглядалася справа прысуду над паслом Бараном, Масловўскай і іншымі беларускімі дзеячамі, засуджанымі на беластоцкім працэсе. **Прынята рэзалюцыя аб інтэрвэнцыі ў гэтай справе ў Лізе Народаў**. У Раду Лігі Народаў скіравана ўжо адпаведнае паданьне.

Цікава, што сябры „Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна“ **ўваходзяць у склад урадаў** Францыі, Англіі, Італіі і інш., ды таксама і ў **склад Лігі Народаў**. .

Працэс Савінкова.

Кароткі пераказ радавага камунікату аб арышце і судзе над Савінковым дае дужа няпоўны абраз гэтае справы і выклікае сумляваньні аб прычынах ідэйнага пераварoту ў душы гэтага прыражонага рэвалюцыянера і—даўгалетняга ворага бальшавіцкае рэвалюцыі. Дзеля гэтага даем тутака падробную справаздачу аб працэсе Савінкова, разасланую прэсе праз „Роста“.

Працэс Савінкова пачаўся раніцай 27 жніўня ў Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда ў устаноўленым працэсуальным парадку. Прысутны: прэса і заграгічныя карэспандэнты. Чытаецца абшырны акт абвіненьня, у якім пераказуецца дзеяльнасьць Савінкова, пачынаючы ад рэвалюцыйных тэрорыстычных актаў і актаў пры царызьме, канчаючы шпіанажам на карысьць польскага генаральнага штабу.

Працэс багаты драматычнымі мамэнтамі. Сама прысутнасьць у Маскве Барыса Савінкова, які ўасабляе контр-рэвалюцыю, інтэрвэнцыю і шпіанаж, вытварае асаблівую напружаную атмасфэру.

На першае пытаньне старшыні суда, ці ён лічыць сябе вінаватым, Савінков, не вагаючыся, дае пацьвярджаючы адказ.

Галоўны матыў абшырных паказаньняў Савінкова, якія ён дае адкрыта і падробна, гэта — расчараваньне Савінкова ў-ва ўсіх групах контр-рэвалюцыі і расчараваньне ў шчырасьці дапамагаўшых контр-рэвалюцыі чужых дзяржаваў, ды прызнаньне абмылковасьці ўсяе ягонае дзеяльнасьці і справядлівасьці рэвалюцыі.

Савінков апісуе няздольнасьць Керэнскага, Краснова, чорнасоценны характар Донскага цэнтру, сваю сувязь з францускай місіяй у Маскве, спэцыяльна з Нулянсам, Гранарам: адгаварыўшы Савінкова ад аружнага паўстаньня ў Маскве, француская місія парадзіла яму падняць паўстаньне ў Яраслаўлі, абяцаўшы нявыпаўнены аднaчасны дэсант дзьвюх францускіх і аднае англійскае дывізіяў у Архангельску. Ад францускае місіі Савінков атрымліваў значныя сумы грошы, перад Яраслаўлем — два мільёны рублёў. Паўстаньне ў Маскве французы даручылі лепш левым эсэрам, якіх шчодра фінансавалі.

Савінков апісуе сваё ўчасьце ў чэха-славацкай контр-рэвалюцыі: бязраднасьць, інтрыгі эсэраў, генаралаў чэхаславакаў,—паміж іншым кажа аб атрыманьні асабіста ад Масарыка двухсот тысячаў крон спэцыяльна на тэрарыстскія мэты. У часе сваей працы ў Парыжу і Лёндане ў ролі прадстаўніка Колчака і Дэнікіна ён расчароўваецца ў саюзьніках: пераконываецца, што апошнія імкнуліся толькі да аслабленьня Расеі, цкуючы „Белую“ Расею проці „Чырвонае“, выкарыстываючы контр-рэвалюцыю, як арудзьдзе дзеля ўласнае карысьці.

Савінков раскaзывае, што Колчак дастаў ад англічан трыццаць міліёнаў франкаў золатам, прадстаўляўшых 75% аддадзенага англічанамі за Шанхай. Савінков адзначае няўдачу спроб заграгічнага расейскага камітэту дабіцца ад саюзьнікаў для Расеі ўчасьця ў здабычах Вэрсальскага міру. Апавядае аб асабістых перагаворах з Мільеранам, Пуанкарэ, Лойд-Джорджам, Чэрчылем, адзначаючы паміж іншым, што апошні даваў істотную дапамогу. Пастаянная ўніжонасьць перад саюзьнікамі, у тым ліку гордасьць амэрыканцаў, зьяўляліся для Савінкова маральнымі мукамі.

Савінков апісуе поўны расклад расейскае эміграцыі, пaступовае сваё расчараваньне ў магчымых выніках контр-рэвалюцыі. Савінков пачаў прыхадзіць да пераканаыньня, што сялянства йдзе за радавою ўладай.

Савінков увайшоў у сувязь з Пілсудскім дзеля падрыхтаваньня вайны з Радавай Расеяй. Апіраючыся на фінансавае падтрыманьне з боку францускае ваеннае місіі ў Варшаве, ён з'арганізаваў дабравольную армію. Савінков супрацоўнічаў з Булак-Балаховічам, якога называе напоўбандытам, стаўшымся запраўдным бандытам, грабежцам і пагромшчыкам. Савінков заяўляе, што рабункі і пагромы рабіліся паміма яго, Савінкова, волі.

Пасьля апошняе няўдачнае спробы з'арганізаваць контррэвалюцыйны, так-званы „зялёны“ сялянскі рух, Савінков аддаецца шпіанажу на карысьць польскага Генаральнага штабу і францускае ваеннае місіі.

На падсуднага робіць прыгнятаючае ўражэньне прачытаньне на судзе ягонага пісьма да францускае місіі, у якім ён прапанүе свае услугі і просіць грошы...

Далей Савінков апавядае аб узноўленых ім, пасьля высылкі яго з Польшчы на жаданьне Радавага Ураду, перагаворах з урадамі Захаду. Няўдачныя перагаворы з Муссоліні. У Празе ён устанаўлівае, што выдаваная Чэскім Урадам дапамога эсэрам ідзе з вывезеных легіанэрамі з Сібіры расейскіх цэннасьцяў, з якіх зложыўся капітал цяперашняга легіанэрскага банку.

Вясною 1923 году Савінков дайшоў да аканчальнага пераканаыньня аб немагчымасьці інтэрвэнцыі, бясплоднасьці контррэвалюцыі і няўхільнасьці прызнаньня.

У нязвычайна выразіцельным апошнім слове вінавачаны хоча „аб'ясьніць, якім чынам стары рэвалюцыянер, учасьнік дзесяткаў пакушэньняў на царскіх міністраў, учыніў найстрашнейшыя праступленьні проці работнікаў і сялян свайго краю і стаўся вінавайцам крывавых бед бацькаўшчыны". Савінков кажа, што зачыненьне ў царскіх вастрогах, а пасьля эміграцыя адарвалі яго ад народных масаў, настраеньняў якіх ён не разумеў.

„Перад абліччам пралетарскага суда расейскага народу я, Савінков, заяўляю, што памыляўся, прызнаю Радавую Ўладу і кажу ўсім эмігрантам: хто любіць расейскі народ, павінен прызнаць Радавую Уладу. Гэтая заява для мяне цяжэйша, чым будзе ваш прыгавор. Я прыйшоў да пераканаўньня, што народ—з вамі, не цяпер, калі ззаду вінтоўкі, а год назад у Парыжу, на волі. Вярнуўся ў Расею, бо ня верыў у тое, што аб вас апавядалі. Чакаю сьмяротнага прысуду, ласкі не прашу. Рэвалюцыйнае сумленьне вам напомніць, што я быў рэвалюцыянерам".

Пасьля трохгадзіннае нарады—прыгавор: засуджаны на найвышэйшую меру кары; аднак, прыймаючы пад увагу зробленыя Савінковым заявы, суд пастанаўляе прасіць Цантральны Выканаўчы Камітэт ССРР зьмягчыць кару.

Як ужо ведама, кара сьмерці заменена Савінкову на 10 гадоў вастрогу.

Поўнае памілаваньне Савінкова.

Даносяць з Масквы, што Цантральны Выканаўчы Камітэт ССРР **зусім памілаваў Савінкова.**

Цяпер астаецца толькі, каб Савінкоў заняў у ўрадзе ССРР адпаведнае яго здольнасьцям месца, чаго і можна спадзявацца неўзабаве.

„Праменяваньне польскае культуры".

Нас часта вінаваціць польскае грамадзянства (нават і яго найбольш прызваітая частка)—у тым, быццам мы малюем беларускае жыцьцё ў Польшчы лішне „чорнымі фарбамі"... І, каб даць выхад тэй „праўдзе", якая шмат „сьвятлей" глядзіць на беларускую справу ў Польшчы і „жадае голасу", польская ўлада, пры агульным здаваленьні ўсяго польскага грамадзянства, дала магчымасьць гэтаму „беларускаму голасу" гучэць аб гэнай „праўдзе", якая гэтак патрэбна для Польшчы „навываз", бо—каго-ж, запраўды, яна зьвядзе ўсябе дома?

І вось, пакуль казённыя „беларускія публіцысты", смокчучы казённую „пазнанку" ды закусываючы казённымі „бутэрбродамі", выхваляюць з усіх сілаў райскае жыцьцё беларускага селяніна пад польскім панаваньнем, вось што пішуць пра гэтае самае жыцьцё тыя з палякоў, якія сталі ў больш-менш нармальныя адносіны да праўды аб жыцьці беларускага насяленьня, зрабіўшыся воляй прыпадку залежнымі ад яго—яго выбарнымі прадстаўнікамі ў парляманце.

У радзе нумяроў газэты „Robotnik" друкаваліся карэспандэнцыі пасла Воліцкага (з Піншчыны) аб „нязьмерна сумных выпадках у палескіх вёсках", а цяпер, у адным з апошніх нумароў гэтае газэты, той-жа аўтар, падсумоўваючы ранейшыя факты, падае яшчэ новыя, сцьвярджаючы, што, „ня гледзячы на дакладныя ўказаньні мясцовасьцяў, прозьвішчаў і датаў,—*ніхто ў Польшчы—ані грамадзянства, ані ўрад—ніяк не рэагаваў на ўсё гэта*".

„Відаць, кіруючыя сфэры,—піша пасол,—лічаць гэткі стан рэчаў зусім нармальным.—Пачынаючы ад войта і паліцыянта, а канчаючы старостай,—ад лясьнічага да крэсовага абшарніка,—палескі селянін церпіць зьдзек, нячуваны нідзе вызыск, часта несправядліва асуджаецца і караецца судом, а нават бывае біты...

„Даволі ўспомніць толькі справу ліквідацыі сэрвітутаў.—Як часта—насупраць усім падставам права—зямельны камісар разам з абшарнікам і войтам, пры дапамозе паліцыі,—абрабоўвае сялян з іх апошняе пашы!..

„Як-жа часта паліцыя, на заклік абшарніка, выкідае селяніна з яго ўласнай зямлі, ці арэнды—без усякага суду...

„А спагаяньне падаткаў?!—Дык-жа сцьверджана, што тутака квіты выдаваліся вырваныя з кніжкі, без пячаці, з нячытэльным расейскім (?) падпісам,—лічучы да ўсяго гэтага яшчэ *злоты на 2.400.000 марак*!..

„Сцьверджана, што тутака войты за гэткі спагон падаткаў спраўлялі сваім жонкам футры!

„Нядаўна публічна „выполічкавалі" (папросту—далі ў морду..) аднаго „гміннага ўрадоўца" ў вёсцы Дубоі за тое, што ён з аднэй толькі вёскі і, як аказалася пасьля, зусім не праз абмылку... хацеў ашукаць і абрабаваць, пры спагоне падатку, на некалькі тысяч злотых!..

„Але найбольшай ганьбай для тутэйшай адміністрацыі зьяўляюцца выпадкі (?) біцьця сялян польскай паліцыяй".

Тут аўтар апавядае зусім не „выпадковы" выпадак катаваньня ў Лунінецкім паліцэйскім „арыштце" селяніна Жымніча з Кажан-Гарадка.

Апавядае зусім *звычайную* на „Крэсах" гісторыю аб тым, як лунінецкага камісара паліцыі Рыхтэра, напісаўшага, у прысутнасьці самога пасла, *праўдзівы* пратакол дапросу катаванага Жымніча, „на яго ўласную просьбу"... выгналі са службы і аддалі пад суд, а той камандант кажан-гарадзецкага пастарунку, які катаваў Жымніча, ня толькі астаўся на месцы, але яшчэ і *атрымаў падзяку ад старосты за „энэргію, патрыятызм і... ахвярнасьць"*!..

Як-жа каталі Жымніча?—І ў гэтым таксама няма нічога „выпадковага" ці выняткова, бо ўсё—зусім звычайныя, агульна-ведамыя, аднолькава-практыкаваныя ўсюдых у польскіх арыштах, асабліва на „Крэсах", „спосабы дабываньня „праўды", якая пасьля ідзе ў „акты абвінавачаньня", адтуль—у суды, у газэты,—у польскія ці беларускія „Грамадзкія Галасы",—у „дыпляматычныя ноты", „загранічную прапаганду" і г. д.

„Як-жа білі Жымніча?—пытаецца аўтар.

„Яго сьпярша разьдзелі дагала, абвязалі мокрым лахманом, заткнулі рот, каб ня крычэў, і тады пачалі біць шомпалам ад карабіна па пятах... Калі катаваны траціў прытомнасьць, тады яго аблівалі сьцюдзёнай надой і ізноў каталі... Гэтак зьдзекаваліся над ім *цэлую ноч*, а раніцай запёрлі яго (гэта—новае!) да спэцыяльна збудаванага *пакою з 2 печамі, дзе, распаліўшы да-чырвана абедзьве печы, трымалі яго—ўлетку—праз 3 сутак, не даючы яму ані кроплі вады, даючы яму толькі паўфунта хлеба ў дзень*"...

Гэта—„выпадак", скажуць „грамадзкія галасы"...

Дык вось на гэта ізноў адказывае сам аўтар:

„Атрымаўшы, заместа суду, падзяку ад адміністрацыі за гэткую „энэргію і ахвярнасьць", камандант пастарунку ўжо *пасьля гэтага* за кароткі час здалеў пабіць і скатаваць гэткіх людзей у тым самым Кажан-Гарадку: Длугалевіча Хведара пабіў па твару, Ховэйновіча Рыгора, зьвязаўшы яму рукі, пабіў шабляй па твару... Кротышэўскага Кірылу пабіў па твару... Камара Сьцяпана нейкім тупым арудзьдзем скалечыў так, што сьвядоцтва мяйсцовае бальніцы сцьвярдзіла аж 50 ран на ўсім целе... Аўтар вылічае яшчэ 9 сялян, якіх той-жа ахвярны польскі „патрыот" на беларускіх „Крэсах" біў, катаваў, закладаючы патроны паміж пальцаў, укладаючы пальцы ў шчыліну дзьвераў і гэтак далей... І ўсе яны—*толькі беларусы*, паміж імі—дзьве кабеты...

Вось—сьпісак пакрыўджаных людзей у апошні час *у адным толькі мястэчку „патрыотамі" аднаго толькі паліцэйскага пастарунку*!.. Што-ж робіцца на ўсім Палесьсі, аб гэтым ведае толькі сам беларускі селянін, які баіцца нават перад кімколечы сказаць, хто і калі яго скрыўдзіў...

„Б'юць, паночку, б'юць усе—і войт б'е, і паліцыя б'е, і пан б'е",—чуваць на кожным кроку з вуснаў палескага хлопа"...

„Надарма толькі пробаваць выцягнуць з яго, хто ласьне яго біў, бо ён адказывае: „паночак паедзе, а яны будуць біць далей"...

„Вось—што называецца „*праменяваньне польскай культуры на крэсах*",—заключае аўтар. „Вось—якім спосабам хочуць здабыць беларускага хлопа для Польшчы"...

Наіўны, запраўды, гэты пэпээсаўскі „паночак-пасол", якому беларускі селянін баіцца расказаць аб зьдзеках з боку тых, што таксама, як і ён, гавораць па-польску...—Наіўны ён, калі шукае нейкіх „зьменаў", нейкага „новага курсу", нейкіх „праменьняў польскай культуры"—там, у глухой правінцыі, сярод беларускага сялянства...

Там пануе, як і панавала ад пачатку польскага панаваньня, заведзеная яшчэ... самім панам Пілсудскім з яго „маршаламі" Шэптыцкім, Асмалоўскім, Івашкевічам і інш., з яго ППС-дэфэнзывамі—тая самая „культура", якая панавала тутака 2—3 сталецьці назад...

„Калі-ж п. пасол хоча запраўды знайсьці „культуру", „новы курс", усялякія „праменьні" і, наагул, шчасьлівае „беларускае" жыцьцё, дык ня трэба яму ехаць да якойсьці „палескай глушы", але папросту—з камфортам пад'ехаць да звопчыку да... віленскага „Грамадзянскага Сабраньня"...—Толькі тут ён убачыць і пачуе „праўду", аб Беларусі пад Польшчай, тут у „Голасе" гэтага „запраўднага беларускага грамадзянства" прачытае „сьветлыя артыкулы", якімі гэтак захапляецца цяпер польская прэса—з „Kur. Polskim" на чале!..

Х.

„Белыя сакалы", ці „чорныя крукі"?

Карэспандэнцыя з Вялейкі, зьменшчаная ў газ. „Dzien. Wil.", раскрывае з уласьцівай гэтаму органу мясцовых „нэграў" шчырасьцяй запраўдны характар тэй „спартыўнай" і „апалітычнай" арганізацыі, якую прадстаўляюць гэтак званыя „сакалы"...

Даем слова карэспандэнту газэты п. Обста:

„Ня будучы арганізацыяй партыйнай, але стаючы няўхільна на грунце „нацыянальна-польскім" (разумей: эндэцкім...), і на варце інтарэсаў нашай дзяржаўнасьці", кожнае з правінцыяльных (сакаліных) гнёздаў, побач з сваей ідэйнай працай, зможа адыграць важную ролю тормаза—перашкоды для, на жаль, вельмі частых выступленьняў розных мітынговых рэвалюцыйных дзеячоў, якія ў прысутнасьці арганізаванай грамады нацыянальна (па-польску) мысьлячых людзей, ня будуць мець магчымасьці, як дагэтуль, без належнага адпору гаварыць перад малакрытычнымі беларускімі сялянамі ўсё, што прынясець на язык цесны мозаг хворай сацыялістычна-камуністычнай дактрыны,—бо яны заўсёды будуць ужо цяпер лічыцца з тым, што спасярод сабраўшыхся знойдзецца больш-менш чысьленая група

Літэратурны плягіят.

Сярод беларускіх пісьменьнікаў 40—50 гадоў мінулага сталецьця бачым дзьве групы, якія розьняцца міжы сабой адбіцьцём на іх двух розных культурных уплываў: польскага і маскоўскага. Пераважаюць пісьменьнікі, узгадаваныя ў польскай культуры,—і гэта зусім зразумела: польскім уплывам падлягала вялізарная большасьць краёвае шляхоцкае інтэлігенцыі, з якое рэкрутаваліся нашыя першыя аўтары; да таго-ж высока разьвітае ў палякоў нацыянальнае пачуцьцё прабуджала такое-ж пачуцьцё ў беларусаў, хоць і ўзросшых пад чужацкімі ўплывамі, пад той час, як для нашай абмаскоўленай інтэлігенцыі, прадстаўляўшай меншасьць, нацыянальныя пытаньні блізу не істнавалі, як не істнавалі яны для „дзяржаўнай" маскоўскай нацыянальнасьці, не адчуваўшай, што такое нацыянальны уціск.

У „Гісторыі Беларускае Літэратуры" Максіма Гарэцкага пісьменьнікам нашым з польскай культурай і адводзіцца шмат больш месца, чым пісьменьнікам, узгадаваным пад маскоўскімі ўплывамі і пісаўшым пераважна па-расейску. Спасярод апошніх разгледжана творчасьць адно толькі *Паўлы Шпілеўскага*, у якім, паводле характэрыстыкі Гарэцкага, „пастаянна змагаўся этнограф з бэлетрыстам"—заўсёды з шкодай і для этнаграфіі, і для бэлетрыстыкі.

Але і агляд твораў П. М. Шпілеўскага ў Гарэцкага—далёка ня поўны. Наш паважаны гісторык роднае літэратуры ўспамінае адзін толькі твор Шпілеўскага: „Падарожу па Палесьсю і Беларускаму Краю", надрукаваны ў журнале „Современникъ" за 1853 4 і 5 г. г. і выпушчаны ў 1858 годзе асобнай кніжкай. За тое Гарэцкаму невядома „спроба пяра" Шпілеўскага на грунце драматычнае творчасьці, якую прадстаўляе кніжачка „*Дожинки. Бѣлорусскій народный обычай. Сценическое представленіе въ двухъ дѣйствіяхъ, съ хорами, пѣснями, хороводами и плясками бѣлорусскими. Соч. П. М. Шпилевскаго. Санктпетербургъ. 1857 г.*"—з прадмовай, X і 60 стр. in 16°. А іменна гэты твор найлепш і пацьвярджае пагляд Гарэцкага на творчасьць Шпілеўскага.

Дый Шпілеўскі ня гоніцца за славай паэта—драматурга: ў прадмове свэй да „Дажынак" аўтар кажа, што „назваўшы твор свой сцэнічным прадстаўленьнем, а ня драмаю, ці камэдыяй", ён „ужо гэтым самым абазначыў зьмест яго, які, бяз ніякіх пасяганьняў на драматызм ці камізм, зьмяшчае нарыс народнага жніўнага сьвята ў форме сцэнічнага твору". Пісаў ён гэты твор дзеля таго, каб пазнаёміць расейскае грамадзянства (твор напісаны мяшанай мовай—беларускай, з перакладамі на расейскую, і расейскай) з Беларусьсю: „А ў нас,—кажа ён у вынасцы на 1-ай страніцы,—так мала ведаюць аб Беларусі (для многіх яна terra incognita), ня гледзячы на тое, што яна становіць значную паласу нашае айчызны і да таго паласу першапачатнае старадаўнае *племянное* Русі".

Прадмова Шпілеўскага, пасьвячоная пытаньню аб паходжаньні беларускіх дажынак, мо' зьяўляецца найбольш цэннай часткай кніжкі, а гэта затым, што самыя „Дажынкі", як „сцэнічнае прадстаўленьне", коратка кажучы, *сьпісаны з „Сялянкі" В. Дунін-Марцінкевіча*!

Ужо самы замысел „Дажынак" з пераадзяваньнем паненкі, Веры Палескай, за сялянку ўзяты жыўцом у Марцінкевіча. Розьніца толькі ў тым, што Вера Шпілеўскага, пераадзеўшыся за сялянку, ідзе жаць на дажынках у свайго жаніха, Пётры Драўлянскага, проста каб зрабіць апошняму сюрпрыз,—а Юлія Марцінкевіча робіць свой маскарад з ідэйнай мэтай: каб прывабіць прыехаўшага з падарожы па Эўропе свайго кузэна, Кароля Лятальскага, да беларускага сялянства і гэтак удзяржаць яго ў ягоным сямейным гняздзе, дый даць сялянам добрага гаспадара і апякуна.

Але асабліва ярка кідаецца ў вочы „запазычаньне" ў Марцінкевіча, калі пачнем чытаць твор Шпілеўскага ад першае сцэны. Як і ў „Сялянцы", рэч дзеецца перад карчмой, куды *войт Наум* (той самы, што і ў Марцінкевіча, бо таксама сыпле прыгаворкамі!) загадаў сялянам сабрацца, каб выслухаць панскі прыказ. Зьяўляецца сярод сялян і Марцінкевічаўскі Ц*іт*. Як у „Сялянцы" сабраўшыяся робяць розныя дагадкі аб прычыне войтаўскага загаду, ды кажуць аб *камэце*,—так і Ціт у Шпілеўскага, пачуўшы, што войт Наум сядзіць у карчме, кажа: „Ну, дык пойдзем туды да яго... што-ж ён за *камэта* гэткая?"

Арандар панскае карчмы, Янкель,—гэта ў „Дажынках" двайнік Марцінкевічаўскага арандатара Іцкі.—Шпілеўскі паўтарыў навет выведзены Марцінкевічам эпізод з мелам, на канцы раздвоеным: пры запісываньні на дошцы доўгу за выпітую гарэлку—Наум, пацягнуўшы мелам раз, сам робіць дзьве рыскі....

Аднак, у трактоўцы выведзенага жыда ў Марцінкевіча і Шпілеўскага ёсьць вялікая розьніца. Марцінкевіч—далёкі ад усякага антысэмітызму і малюе свайго Іцку бяз ніякае злоснае тындэнцыі: проста, як бытавы абразок. І адносіны паміж сялянамі і жыдом пазбаўлены ў Марцінкевіча і ценю варожасьці, нацыянальнае ненавісьці.

Вартаўнікоў Нятыкальнасьці нашай Айчыны і Яе Сьвятасьці (вялікія літэры — ў арыгінале!), якая бязсумліўна, як адзін чалавек, патрапіць прымусіць да належнае пашаны да Польшчы і да ўсяго, што польскае, ды прычыніцца гэтым да спыненьня нязгоды (?!) і ўзаемнага цкаваньня нашых грамадзян адзін на аднаго"...

Вось якую задачу бяруць на сябе, побач з сваей „ідэйна гімнастычнай працай" нагома і рукома, польскія „крэсавыя" сакалы!...

Кажучы прасьцей — без вялікіх літараў і галосных слоў, — гэтыя сакалы будуць папросту тварыць *эндэцка-асадніцкія баёўкі, якім з віленскага цэнтру будзе даручана перашкаджаць беларускім паслам рабіць справаздаўчыя мітынгі для сваіх выбаршчыкаў на мясцох. Ім будзе даручана рабіць на пасольскіх вечах скандалы, бойкі, фабрыкаваць „адпор насяленьня"*, — і ўсё гэта дзеля таго, каб даць магчымасьць і повад умяшацца паліцыі — дзеля разгону мітынгу...

Што ў склад гэтай „сакольскай" арганізацыі ў першую чаргу ўвойдуць найбольш „крытычныя" і „ідэйныя" элементы нашай правінцыі—польскія асаднікі, у гэтым ня можа быць ніякага сумляваньня. У цэлым радзе нашых карэспандэнцыяў і інтэрпэляцыяў нашых паслоў ужо ярка рысавалася „ідэйна-рэвальвэрная" праца асадніцкіх бандаў у пастаці зрываньня нашых пасольскіх справаздаўчых мітынгаў.

Можна сабе лёгка прадставіць, якое „спыненьне нязгоды і ўзаемнага цкаваньня" разьвядуць гэткія „сакольска асадніцка-дэфэнзыўныя" баёўкі, прымушаючы да „пашаны ўсяго, што польскае", — на мітынгах паслоў, якія ня толькі маюць права, але і выразны абавязак — якраз *крытыкаваць* усё тое благое, што робіцца ў Польшчы польскім урадам, зусім ня маючы ніякага абавязку (на гэта ёсьць купленыя „грамадзкія галасы!") — хваліць і выслаўляць тое, што забівае палітычна, культурна і эканамічна цэлы народ, руйнуючы гэтым адначасна і самую польскую дзяржаўнасьць...

Што датычыць запраўднай пашаны да гэтай дзяржаўнасьці, дык някрытычна-цесныя мазгі як вялейскіх, так і віленскіх спэцыялістаў ад спорту ніколі таго не зразумеюць, што гэтая пашана з боку народу здабываецца толькі паважнай і ахвярнай працай на карысьць духоўнага і матар'яльнага дабрабыту насяленьня!

Палітычныя падзеі.

Лёйд-Джордж аб усходняй граніцы Польшчы.

У сваей газэце „Дэлі Кронікль", у артыкуле аб рэзультатах Лёнданскай Канфэрэнцыі, Лёйд-Джордж пералічае ўсе тыя небясьпекі, якія пагражаюць эўрапэйскаму міру,—перадусім небясьпеку, пагражаючую Адэсе з прычыны таго, што Бэсарабія належыць да Румыніі, а Беларусь — у часьці сваей да Польшчы. Ён кажа, што Расея, пасьля свайго адраджэньня, заявіць прэтэнсіі на свае тэрыторыі. Ен прадбачыць паўстаньне украінцаў у Галіччыне, у выпадку якога Расея не астанецца нэйтральнай.

Лёйд-Джордж толькі ня кажа аб тым, што больш паловы ўсей тэй крыві, якая пральецца пры зьдзейсьненьні таго, што ён толькі цяпер „прадбача", падзе на яго, Лёйд-Джорджа, галаву.

„Радыкальная зьмена польскай палітыкі".

„Француская" прэса ў Польшчы страшэнна абураецца на артыкул аб Польшчы „ведамага фанатычнага ворага Францыі", п. Гаррысона, ў газэце „Дэлі Ньюз", які даводзе, быццам у апошнія месяцы адбылася радыкальная зьмена ўсей польскай заграннічнай палітыкі. — Гэта зьмена выяўляецца быццам у рашучым адыходзе Польшчы ад Францыі і ў шуканьні зблізкэньня з Ангіяй і Нямеччынай.

Газэты пішуць, што артыкул Гаррысона, ня гледзячы на розныя кампліманты па адрасу Польшчы, робіць наагул „фатальнае ўражэньне" галоўным чынам дзеля таго, што аўтар пазываецца на „высокія сфэры" ў Польшчы.

Можа ўжо і запраўды Польшча перакаланалася ў тым, што „зблізкэньне" з Францыяй дае, як у байцы, ўсё разам! Але, як прачхнешся з баечнага сну, дык толькі тады зразумееш, што падаравана ўсё чужое.

Зблізкэньне з Англіяй і Нямеччынай розьніцца тым, што за яго трэба будзе заплаціць мо' нават і вельмі дорага. Але затое ўсё, што астанецца, будзе ўжо моцна і трывала „сваё", і пасьля гэтага ўжо можна сабе нават спаць і ізноў рамантычна лятуцець у сьне аб... панаваньні над усім славянствам...

„Няўдаўшаяся здрада стану".

Блазны з „Dzien. Wil." ізноў паўтараюць дурную брахню аб тым, быццам у Пінску меў адбыцца нейкі „зьезд паслоў і сэнатараў украінскіх і беларускіх", на якім яны быццам маніліся (як гэтага ад усяго сэрца жадаў бы і не адзін „Dzien. Wil."!!) адрачыся ад сваіх пасольскіх мандатаў, праклямаваць Незалежную Беларускую Рэспубліку і далучыць яе да СССР!!.

Быццам гэтая думка цяпер пакінута—з прычыны непаразуменьняў паміж пасламі і сэнатарамі, бо некаторыя пашкадавалі пасольскіх дыетаў (пэнсіяў)...

Адзін з сучасных нямецкіх філёзафаў дасьціпна кажа, што відавочна дурной брахні ня трэба распаўсюджываць нават шляхам пярэчаньня ей... Можна да гэтага дадаць: за выключэньнем выпадку, калі якраз, як у гэтым нашым, — трэба даказаць таксама відавочную дурноту брахуна...

Што датычыць „далучэньня" і г. дал., дык аб гэтым ані паслам, ані сэнатарам няма чаго клапаціцца: аб гэтым лепш за ўсіх стараецца... сама польская палітыка на „Крэсах"...

„Добрыя" адносіны.

Польскі міністар загран. спраў, п. Скшыньскі, ў гутарцы з парыжскімі журналістамі, рысуючы агульнае палажэньне Польшчы, заявіў, што „адносіны з Расеяй — настолькі паправны, наколькі гэта толькі магчыма"...

Толькі што атрыманы польскім мініст. заграннічных спраў востры пратэст СССР проці паступку польскай паліцыі з прадстаўніком Внешторгу СССР у м. Стоўпцах вельмі яскрава паказывае як раз тое, чаго не дагаварыў спрытны п. Скшыньскі ў Парыжу...

Польскі паліцыянт затрымаў на вагзале ў Стоўпцах радавага ўрадоўца Внешторгу п. Клейгуса, трэбуючы ад яго пашпарт. Той адказаў, што ён — радавы ўрадовец, і ніякіх „легітымацыяў" яму не трэба. Калі паліцыянт пачаў, відаць, „ташчыць і ня пушчаць" п. Клейгуса, дык той, як падае, паводле польскіх урадавых вестак, „Kur. Pol.", ударыў паліцыянта па твару. Тады на помач пастарунковаму падасьпеў пшодоўнік яшчэ з 2 паліцыянтамі і... пачалася бойка... — „Клейгус (паводле данясеньня паноў паліцыянтаў) кінуўся на (чатырох!) паліцыянтаў, біў іх (чатырох!) кулакамі, грыз іх (чатырох паліцыянтаў!!) зубамі і абкідаў патокамі „расейскіх ругацельстваў"... Урэшце (!) яго абезуладнілі, закавалі ў кайданы (!) і пасадзілі пад арышт...", — дзе ён і прасядзеў ад 1 гадзіны ў начы да 11 раніцы, калі ён, „вылегітымаваўшыся", быў выпушчаны з-пад арышту...

Вось красамоўны „przyczynek" да добрасуседзкіх, аснаваных на ўзаемнай пашане, „рыжска мірных" адносінаў паміж СССР і Польшчай!..

Арышты камуністаў.

31 жніўня ў Катавіцах арыштаваны выдатныя камуністы Бітнэр і Ольшэўска.

„Шырэньне панікі".

Пад гэтым загалоўкам „Dzien. Wil." пярэчыць вестцы аб мабілізацыі 3 ці 4 гадоў запасу ў СССР, дадаючы, што „радавыя крыніцы выкарысталі маневры арміі СССР, каб пашырыць трывожныя весткі і гэтым пашкодзіць інтарэсам Польшчы (крэдыту!) і Румыніі, а таксама шырыць паніку сярод насяленьня нашых „Крэсаў"...

Можна дадаць, што далёка ня ўсё насяленьне „Крэсаў" такое ўжо палахлівае, як думае „Dz. Wil.".

Напады на пагранічны Галіччыны.

У ноч на 2 верасьня ў Коломыйскім павеце невядомыя добра ўзброеныя людзі напалі на паліцэйскі растарунак, разаружылі патруль і з аднятых карабінаў пачалі страляць да паліцыянтаў, ранючы аднаго з іх.

Пасьля доўгай страляніны бандыты, карыстаючыя цемрай, уцяклі бязкарна.

У дзень 1 вер. другая партыя напала на пагранічны пастарунак у Чарткоўскім павеце, цяжка раніўшы пастарункавага.

Бандыты — ў форме радавай пагранічной старожы, вельмі добра ўзброены і ў часе нападу заяўлялі, што яны з перадавога атраду чырвонай арміі, якая быццам ужо йдзе за імі...

Пагоня за імі не дала ніякіх рэзультатаў...

Дарагоўля ўжо пачала скакаць...

Ня гледзячы на тое, што Польшча ўжо ў апошнія часы лічыцца **найдаражэйшым краем ў-ва усім сьвеце**, дарагоўля ў ёй не перастае павышацца, а ў апошнія дні дык папросту пачала скакаць у гару так сама, як ня так даўно марка спадала ўніз...

Напрыклад, — у Варшаве мястовы магістрат сцьвярдзіў падаражэньне бульбы і сала на $12\frac{1}{2}$ процэнтаў, сьвініны на 6,6 проц., яек — на 9 проц., масла — на 7 проц., кавы, гарбаты і г. д. на 5 проц., **толькі за адзін тыдзень!**

Хлеб таксама падаражэў, бо п. Грабскі дазволіў абшарнікам вываз яго заграніцу і забараніў вываз „дэманстрацыйна" толькі тады, калі было ўжо вывезена амаль ня ўсё, што меліся вывезьці, і цана жыта ўжо паднялася аж на 40 проц.!..

Вываз польскага хлеба ў запраўднасьці спыніў ня п. Грабскі, але тое, што Нямеччына, куды пераважна вязуць польскі хлеб, мае яго ўжо даволі, і там ён ужо дзешавей, як у Польшчы, бо падаражэў толькі на 0,6 проц. Асабліва цікавы тады дамаганьні дамброўскіх прамыслоўцаў аб паніжэньні на 5% платы работнікам.

Новы праект зямельнай рэформы.

Пястоўскай дэлегацыі, якая зьвярнулася да міністра „зямельных рэформаў" у справе падтрыманьня асаднікаў, новы міністар сказаў, што ён у восені падасьць у Сойм зусім новы праект зямельнай рэформы, абаперты на падставах закону 16 ліпня 1920 году!.. Міністар абяцуе старацца, каб у прышлым бюджэце яго міністэрства атрымала вялікшыя крэдыты.

Асабліва цікава і пікантна гэтая заява аб вельмі „ахвярным" зямельным законе 1920 г. Як ведама, гэты закон быў прыняты Устаноўчым Соймам у „гарачым ліпню", — якраз у першыя дні „бальшавіцкай навалы"... Тады, як ведама, паны-абшарнікі, а нават і паны біскупы гатовы былі для „ўкаханага люду" аддаць — усю зямлю, каб толькі ён сваей крывёй адратаваў ім іх маёнткі, якія пасьля, зразумела, павінны-ж вярнуцца цалком да „законнага" ўласьніка!..

У-ва ўсякім разе, ня гледзячы на ўсю яе пустату, заява гэтая, як на нашыя часы,—вельмі сымвалічная! Ці ня „трывогі" румынскага калегі адгукаюцца ўжо ў Польшчы?

Аткрыцьце Кангрэсу Лігі Народаў.

1 верасьня аткрылася Агульнае Сабраньне Лігі Народаў. Першым прамаўляў, адчыніўшы паседжаньне, бэльгійскі дэлегат Юманс. Зьехаліся прадстаўнікі 50 дзяржаў.

Старшынёй Кангрэсу выбраны дэлегат Швайцарыі Мотта.

Найгалаўнейшай справай, якую будзе разглядаць Кангрэс, ёсьць справа абмяжаваньня збраеньняў.

2 верасьня адбылося ізноў пленарнае паседжаньне Сабраньня Лігі Народаў, на якім старшыня Мотта абвесьціў рэзультаты выбараў старшыняў 6 сталых камісіяў.

На гэтыя становішчы выбраны пераважна прадстаўнікі малых дзяржаў (апрача Японіі), як Аўстраліі, Панамы, Даніі, Фінляндыі і Румыніі.

Вельмі пікантна, што старшынёй камісіі да спраў разбраеньня выбраны дэлегат Румыніі...

На заступнікаў старшыні Мотты выбраны прадстаўнікі Францыі, Англіі, Італіі, Калюмбіі, Польшчы і Кітаю.

Зачыняючы паседжаньне, п. Мотта абвясьціў, што наступныя 2 паседжаньні будуць заняты справамі ўзаемных гарантыяў і разбраеньня...

Наагул на павестку Кангрэсу пастаўлена каля 30 спраў. Паміж іншымі — справа перагляду пастановы Рады Лігі аб падзеле нэйтральнага польска-літоўскага пасу.

Праект Мак-Дональда.

Газэты падаюць, што праект аб разбраеньні, які Мак-Дональд падаў Лізе Народаў, прадугле-

Ня тое ў Шпілеўскага: ён ужо ў прадмове гаворыць, што аднэй з яго мэт зьяўляецца, па магчымасьці, адмаляваць адносіны сялян да жыдоў і наадварот, і адносіны гэтыя—злосныя, грубыя, з узаемнымі лаянкамі, праклядцьцямі, выражэньнямі ўзаемнае пагарды...

Затое „мілых беларускіх мужычкоў", аб якіх з такім захопленьнем гаворыць Вера ў „Дажынках", Шпілеўскі ідэалізуе на ўзор Марцінкевіча. Таксама і паны яго наскрозь пранікнуты Марцінкевічаўскай патрыярхальнасьцяй, айцоўскімі адносінамі да „мілых мужычкоў".

З боку чыста мастацкага „Дажынкі" шмат уступаюць творам Марцінкевіча. Тут запраўды ня прыходзіцца шукаць „ані драматызму, ані камізму", як папярэдзіў у сваей прадмове сам Шпілеўскі.

З боку этнаграфічнага—цікаўныя песьні беларускіх сялян, сьпяваныя ў часе дажынак, пры сплятаньні вянка, пры аддачы яго пану і т. п. (усяго 8 нумароў). Хаця беларускія тэксты пісаны паводле расейскага правапісу, але ўсё-ж такі запісаны з боку вымовы даволі правільна, з захаваньнем аканьня. Цікава такжа імя „Талака", даванае дзяўчыне, якая нясе пану вянок і сноп жыта наперадзе грамады жнеи. На жаль,—і тут як-раз выяўляецца дылетантызм у этнаграфічнай працы Шпілеўскага!—аўтар ані ў прадмове, ані ў п'есе не высьняе, з якіх ваколіц Беларусі ўзята апісаньне дажынак. Толькі паходжаньне Шпілеўскага з Меншчыны, „у глухіх кутках якое прайшло яго маленства" (гл. Гарэцкага), дае аснову думаць, што Шпілеўскі апісуе звычай з сваей, бліжэй не азначанай, Бацькаўшчыны.

Мо' ў каго узьнімецца пытаньне: з чаго-ж відаць, што плягіят зрабіў іменна Шпілеўскі, а не Марцінкевіч? Вось-жа на гэта перш-на-перш паказуюць даты выхаду ў сьвет памянёных двух твораў Марцінкевіча і Шпілеўскага: „Сялянка" надрукавана ў 1846 годзе, *) „Дажынкі"—ў 1857. Дый паміма таго даволі ўчытацца ў адзін і другі твор, каб перакнацца, каторы з іх—арыгінал.

Чым-жа можна вытлумачыць тую сьмеласьць, з якой Шпілеўскі „запазычыў" гэтак многа ў Марцінкевіча? І на гэта лёгка знайсьці адказ: абодва пісьменьнікі належалі да двух розных па культурным уплывам груп, і пад той час, як Марцінкевіч пісаў „Сялянку" мяшанай мовай *польскай* і беларускай, празначаючы яе пераважна для краёвае спольшчанае інтэлігенцыі,—Шпілеўскі пісаў *на расейску* і па беларуску, разьлічаючы на расейскае грамадзянства, меўшае вельмі мала стычнасьці з краёвымі „палякамі" (—„палякамі" па мове). Дык і вялікае рызыкі ня было, што „пазыка" можа выкрыцца. Ды яна, відаць, і ня выкрылася пры жыцьці абодвух аўтараў, з каторых адзін, *Шпілеўскі, быў бязумоўна пад уплывам свайго земляка Марцінкевіча.* Плягіят выявіўся толькі сяньня, калі мо' ўжо не захаваўся і сьлед ад магілы яго аўтара...

Вільня, 1 ліпня 1924 г.

Ант. Навіна.

*) Напісана „Сялянка" не пазьней пачатку 1844 году, бо на друкаваным экзэмпляры есьць дзьве даты: дазвол цэнзуры на друкаваньне—5 мая 1844 г. і „адабрэньне" дзеля прадстаўленьня—27 студня 1845 г. Надрукавана-ж у Вільні (друк. Завадзкага) у 1846 г.

джывае прапорцыянальнае і неадкладнае разбраеньне пад кантролем Лігі Народаў.

У той самы час міністар паветранай абароны Англіі загадаў пачаць будову раду вялізарных самалётаў, з якіх кожны будзе падымаць 50 жаўнераў з поўным узбраеньнем, кулямёты, гарматы і г. д.

Да хатняй вайны ў Кітаі.

Паслы вялікіх дзяржаў у Пэкіне (сталіца Кітаю) падалі кітайскаму ўраду ноту, у якой заяўляюць, што не дапусьцяць хатняй вайны ў Кітаю і аружна ўмяшаюцца, каб перашкодзіць праліцьцю крыві.

(Якраз: калі ўмяшаюцца, дык разоў у дзесяць праліецца больш крыві кітайскага народу!...).

ХРОНІКА.

Разгром Беларускае Кнігарні. У панядзелак, 1 верасьня, ў 11 гадз. раніцы паліцыя з учасьцем урадоўца з прэсавага аддзелу камісарыяту ўраду на м. Вільню зрабіла „генаральны“ обыск у Беларускай Кнігарні ў Вільні пры Завальнай вул. 7.

Обыск трываў некалькі гадзін. Увесь склад кніг у падвале Кнігарні, дзе гуртаваліся запасы беларускіх друкаў ад 1913 году, абернены ў „стог сена“: паліцыя разрывала вязанкі з кнігамі, якія і зваліваліся на падлогу.

Пазабіралі складаныя тут нумары і камплекты беларускіх газэт, выдаваных у працягу апошніх гадоў (1919, 1920 і т. д.). Камплекты гэтыя маюць вялікую цану для гісторыі нашага краю і беларускага руху наагул і ніколі і нікім *не былі канфіскаваны*. Гэтак сама забраны *не падлягаўшыя канфіскацыям кніжкі*, як „Польская акупацыя на Беларусі“ А. Луцкевіча, ды свабодна прысыланыя праз польскую почту і, значыць, ужо раз прайшоўшыя праз польскую цэнзуру, заграічныя беларускія журналы і г. д.

Склад Кнігарні абярнуўся ў адзін вялізарны шуметнік. Патрэбна многа працы, каб давясьці яго да парадку. І гэты вандалізм зроблены як раз у той мамэнт, калі пачынаецца школьны год: як відаць, віленская адміністрацыя „падгатаўляе“ правядзеньне новых законаў аб беларускіх народных школах, распачаўшы паход проці беларускае кнігі і адзінае крыніцы дабываньня яе—Беларускай Кнігарні.

Да правядзеньня „языковых“ законаў у жыцьцё. Былы Дэлегат Ураду на Віленшчыну, п. В. Роман, які адмовіўся заняць запрапанаванае яму становішча віцэ-міністра да спраў „Крэсаў“ і цяпер зусім кідае ўрадовую службу, у гутарцы з супрацоўнікам газэты „Słowo“ зрабіў дужа цэнныя прызнаньні.

Аказываецца, што, хаця ад увядзеньня ў жыцьцё „языковых“ законаў аддзяляе нас ужо няпоўны месяц (паводле гэтых самых законаў, на гэта назначаны тэрмін 1-га кастрычніка), п. Роман і падлягаючыя яму установы дагэтуль **нічога не зрабілі** дзеля зьдзейсьненя пастановаў гэтых законаў, ды **нават не апрацавалі праграмы ў гэтым кірунку....**

На пытаньне супрацоўніка газэты, ці п. Роман лічыць канечным рэалізаваць „языковыя“ законы, былы Дэлегат Ураду адказаў:

„Ясна, што так. Але, з другога боку, ня лічу выключаным, што **жыцьцё будзе ўплываць на зьмест законаў**“....

„Жыцьцё“ гэнае, ведама, будзе уасабляць нашая знамянітая „крэсавая“ адміністрацыя, і лёгка сабе напярод прадставіць, як яна будзе „ўплываць на зьмест законаў“.

Заява п. Романа, як юрыста і б. кандыдата на становішча „крэсавага“ віцэ-міністра, — нязвычайна характэрная і толькі ў поўнай меры пацьвярджае заверэньні п. Станіслава Грабскага, што новыя законы нічога новага не прынясуць.

Не дарма той-жа п. Роман да вышэйшых слоў дадаў:

„Языковыя законы зьмяшчаюць у сабе факультатыўныя правы, з якіх народ будзе карыстаць у **меру сваей ахвоты**“.

Вось-жа п. Ст. Грабскі даў ужо нам на сваей лекцыі ў Вільні дужа красамоўную запаведзь, як „крэсавая“ адміністрацыя будзе ў беларускіх сялян гэную ахвоту **адбіваць....**

Аб забясьпечаньні спакою на „Крэсах“. У сваей размове з журналістамі мін. Сікорскі перадусім адзначыў, што, паводле точных вестак, папоўненых паказаньнямі захопленых бандытаў, — уся „дывэрсыйная“ акцыя кіруецца з-за кардону ССРР.

„Гэтак званыя „вольныя банды“—дужа добра арганізаваны, маюць кулямёты, па вайсковаму дысцыплінаваны і абучаны і пераходзяць радавую граніцу з точна апрацаванымі плянамі нападу.

„У склад гэтых бандаў уваходзяць камуністы-інструктары, бандыты, жаўнеры чырвонай арміі, а таксама і дэзэртыры з нашага пагранічча, якія спэцыяльна вучацца для гэтых нападаў у адпаведных інструкцыйных цэнтрах, пераважна ў Менску.

„Усё нашае пагранічча падзелена на дзьве галоўныя часткі—паўдзённую і паўночную—украінскую і беларускую. Кіраўніком беларускай часткі зьяўляецца Муха (Міхальскі), які жыве ў Менску, украінскай — атаман Тютюньнік—у Кіеве. З літоўскага боку акцыя часова спынілася, хаця, як нам ведама, дывэрсыйныя літоўскія аддзелы зусім не зьліквідаваны.

„З увагі на гэткае палажэньне спраў урад пастанавіў паклікаць на помач войска, назначыў двух ваенных генералаў на становішчы ваяводаў навагрудзкага і валынскага і даў ім спэцыяльныя паўнамоцтвы“.

Гэтымі мерамі, паводле мін. Сікорскага, урад пакідае „палавічныя спосабы“ і пераходзіць да рашучай, энэргічнай акцыі.

„З гэтай мэта урад хутка зьліквідуе пераходны стан, абапёршы ўсю акцыю абароны пагранічча на падставах чыста ваенных — пры помачы спэцыяльна створанага корпусу пагранічнай варты“. Гэты корпус будзе аднак-жа ў распараджэньні міністэрства ўнутраных спраў, але дысцыпліна, вучэньне, арганізацыя і суд у ім будуць чыста ваенныя.

Пасольскі мітынг. 6 жніўня г. г. адбыўся мітынг у в. Порплішчэ, Дунілавіцкага пав. Справаздачу рабіў пасол П. Мятла. Ня гледзячы на дождж, народ з вялікай зацікаўленасьцю праслухаў справаздачу. Сабралі на прэсавы фонд 2 злоты 15 грошы і 2.300.000 пол. мар.

Паліцэйская кавалерыя ў Вільні. Віленскія газэты падаюць, што мястовая паліцыя мае аж 350 конных паліцыянтаў!.. Мілы Божа!—каго-ж яна мае даганяць на конях у месьце!? Ці-ж зладзеі ўжо пачалі конна ўцякаць з накрадзеным дабром?..

Здаецца-ж не... Дык зладзеям, як сьцьвярдзіла аднагалосна нядаўна ўся Рада места Вільні, паліцыя дае патроху „жыць і працаваць“ у месьце...

На каго-ж гэта ў „чыста польскай Вільні“ гэтая паліцэйская кавалерыя?!..

Весткі з вёскі.

Крулеўшчызна, Дунілавіцкага пав.

Праяжджаючы цягнікам, часта здараецца бачыць цікавыя рэчы. Вось, напр. 16/VIII на станцыі Крулеўшчызна кожны падарожны быў зацікаўлены кучкай людзей, якія сядзелі на „пэрроне“ станцыі і чакалі адпраўкі да пана Дунілавіцкага старосты. У вочы кожнага кідаліся раскіданыя рэчы, абарваныя дзеці. Усё разам напамінала часы вайны: безканечных „бежанцаў“. Смутак агартаў душу, як паглядзіш на змучаныя твары, выплаканыя вочы старухі, на ўбогую вопратку, пачынаючы з зашмальцованай зрэбнай кашулі мужчын і канчаючы разорванымі кашулёнкамі дзяцей. Куча вузлоў, разьвешаныя ручнікі і акучы на плоце ў рад з некалькімі ручнымі саганкамі дапаўнялі малюнак часовага прыпынку гэтых „бежанцаў“ 1924 г.

Сталі мы задаваць пытаньні: хто, куды, чаго?

Гісторыя кароткая: „З Ваўкалак, Дунілавіцкага п. Сяляне. Жыць стала так цяжка, што пусьціліся шукаць лепшай долі. Чуткі да нас дайшлі, што ў Расеі той, хто працуе, можа добра жыць, а тут хоць прападай з голаду. Прадалі, што маглі, і ціханька хацелі перайсьці граніцу. Няўдалася, злавілі. Пасылаюць да старосты. Што будзець, ня ведаем“.

Вось і ўсё. Каротка, але ясна.

Але паглядзіце на твары? Здаецца, так і астануцца яны ў памяці кожнага. Колькі жалю, колькі мукі нарысавана на іх. А што чакае іх? Самае меншае—гэта штрафы, а то можа адседка ў вастрозе і, вядома, біцьцё, а там... там воля, галодная воля!...

Вось, адзін з многіх малюнкаў сучаснага жыцьця нашага селяніна.

Падарожны.

З УСХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ.

Запасы хлеба ў Б.С.Р.Р.

На 1-га ліпня на Беларусі было 300.792 пуды хлеба. З гэтага ліку на складах дзяржаўных органаў было—163.747 пуд., на складах каапэрацыі — 58.850 пуд., і ў прыватных асоб—78.195 пудоў.

Прыём у беларускую студыю ў Маскве.

У панядзелак, 22-га верасьня, а 12 гадз. ўдзень у Беларускім Дзяржаўным Акад. Тэатры у Менску адбудуцца прыёмачныя экзамены для занова паступаючых у беларускую драматычную студыю ў Маскве.

У студыю будуць прымацца тубыльцы Беларусі ад 16 год, якія ведаюць беларускую мову.

Для экзамену трэба прачытаць напамяць некалькі рознахарактарных вершаў, баек, маналёгаў ці апавяданьняў у роднай мове.

Пажаданымі для студыяў зьяўляюцца асобы з галасавымі і музыкальнымі даннымі.

Для прынятых у студыю будзе інтэрнат і дзяржаўная стыпэндыя.

Ніколі не зьнішчажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаемаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Беларускія кніжкі для школ:

Беларуская мова і літэратура.

Biełaruski lementar. *Łastouskaha.*

Nowy lementar dla biełaruskich dzietak. *J. Stankiewicza.*

Зорка, I ч. *Ал. Смоліч.*

Зорка, II ч. *Ал. Смоліч.*

Haściniec dla małych dzietak.

Першае чытаньне. Цё*ткі.*

Родны Край, першая пасьля лемантара кніжка да чытаньня *Л. Гарэцкай.*

Тое-ж. II кніжка.

Тое-ж III і IV кніжка.

Niezabudka. Pierszaja paśla lementara czytanka. *Łastouskaha.*

Другое чытаньне. *Я. Коласа.*

Siejbit. Druhaja paśla lementara czytanka. *Łastouskaha.*

Rodnyja ziarniaty. Knižka dla szkolnaha czytańnia. Hod II i III. *Łastouskaha.*

Наша Крыніца. Трэцяе чытаньне *Я. Лёсіка*

Prosty sposab stacca u karotkim czasie hramatnym. *Praf. R. Abicht i* J. *Stankiewicz.*

Беларуская граматыка. *Б. Тарашкевіча.*

Biełaruskaja hramatyka. *B. Taraszkiewicza.*

Беларуская правапісь з практыкаваньнямі. Я. *Станкевіча.*

Jak prawilna pisać pabiełarusku. *A. Łuckiewicza,*

Biełaruski prawapis. *A. Łuckiewicza i* J. *Stankiewicza.*

Правапісь чужых слоў. Я. *Станкевіча.*

Беларуска-маскоўскі слоўнік. *М. Гарэцкага.*

Маскоўска-беларускі слоўнік. *М. Гарэцкага.*

Гісторыя беларускае літэратуры. *М. Гарэцкі.*

Хрыстаматыя беларускае літэратуры. *М. Гарэцкі.*

Wypisy z biełaruskaje literatury. *W. Łastouski.*

Naszy pieśniary. *A. Nawina.*

Дыямэнты. Літэратурныя нарысы і выбраныя творы.

Гісторыя:

Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. *У. Ігнатоўскага.*

Кароткня гісторыя Беларусі. *Власта.*

Karotkaja historyja Biełarusi. *Własta.*

Сусьветная гісторыя, ч. II: Сярэднявечныя часы. *Остэрлеф і Шустэр.* Пераклад *А. Луцкевіча.*

Тое-ж, ч. III: Навейшыя часы. Пераклад Я. *Станкевіча.*

Геаграфія:

Геаграфія Беларусі, I і II частка. *А. Смоліча*

Паўкулі (пабеларуску).

Карта Беларусі.

Карта Беларусі (нямая).

Матэматыка:

Арытмэтычная тэрміналёгія. Укладзена Камісіяй Менскага Пэдагагічнага Інстытуту.

Арытмэтычны задачнік. *С. Рак-Міхалоўскага.*

Задачнік Юрэвіча I год.

Тое-ж II і III год.

Элемэнтарная Альгебра, паводле Кісялёва. I і II частка. Апрацаваў *А. Луцкевіч.*

Аснаўныя тэрміны з геамэтрыі. Апрацована Камісіяй Беларускага Навуковага Таварыства.

Слоўнік геамэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў. *Душэўскі і Ластоўскі.*

У друку: Аналітычная геамэтрыя. *А. Трэпкі* (літаграф.).

Фізыка і прыродазнаўства:

Фізыка, ч. I: Мэханіка і цяплыня. *А. Трэпка.*

Фізыка, ч. II: Хваляваньне і акустыка. *А. Трэпка.*

Касмаграфія. *Р. Астроўскага.*

Неба і зоры. Пераклад. *Г. Казячы.*

Батаніка. Падручнік для сярэдніх школ *В. Зеленскага.* Пераклад. *К. Душэўскі.*

Закон жыцьця сярод жывёлаў і расьлін. Перакл. *Г. Казячы.*

Фізыалёгія і анатомія чалавека. Падручнік для сярэдніх школ. *Н. Малышэва.* Пераклаў *Д-р. І. Цьвікевіч.*

Розныя:

Навука сьпеву. *А. Грыневіча*

Школьны сьпеўнік. *А. Грыневіча.*

Праграмы беларускіх пачаткавых школ, укл. Беларускай Цэнтральнай Школьнай Радай.

Як вучыць у новай школе. *А. Луцкевіча.*

Усе гэтыя кніжкі можна купляць і выпісываць з

Беларускае Кнігарні,

Вільня, Завальная вул. № 7.

Рэдактар-Выдавец М. Шыла.

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.